4. Протокол заседания Правления ССК БССРР совместно с художественным советом Гос. Ордена Ленина Большого Театра оперы и балета от 9.07.1949 г. // БГАМЛИ. Ф. 119. Оп. 1. Д. 19. Л. 7—11.
5. Стенограмма Пленума Союза Советских композиторов БССР (15 мая 1950 г)//БГАМЛИ. Ф. 119. Оп. 1. Д. 24.
6. Творческие задачи белорусских композиторов и музыковедов на 1953 г. и план государственных заказов Комитета по делам искусства при Совете министров БССР на 1953 г. (доклад Е.К. Тикоцкого)//Протоколы общих собраний членов Союза советских композиторов БССР. 1953 г. — БГАМЛИ.Д. 119. Оп. 1. Д. 45. Л. 13—43.
7. Стенограмма II съезда СК БССР (заседание 14 марта 1956 г.)//БГАМЛИ. Ф. 119. Оп. 1. Д. 75.
8. Аладава, Р. Мікалай Аладаў: знаёмы і незнаёмы/Р. Аладава//Літаратура і мастацтва. — 1990. — 21 снежня. С. 14—15.

*Пацыенка С.Л.*
*БДУКіМ, Мінск*

## ТРАДЫЦЫІ МІЖКУЛЬТУРНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ НА ПРЫКЛАДЗЕ КУЛЬТУРАТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАГНАТАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У аснове развіцця культуры знаходзіцца патрэбнасць ў адаптацыі да зменлівых умоў. У сувязі з тым, што ні прырода, ні соцыўм не могуць існаваць у нязменным стане, развіццё культуры ўяўляе сабой пастаянны пошук найбольш адэкватнага сітуацыі становішча яе элементаў. Сучасная сацыякультурная сітуацыя характарызуецца ўзмацненнем імкнення культур да страты ўстойлівасці.

Пошук устойлівасці культуры пасля парушэння раўнавагі можа рэалізавацца ў двух альтэрнатыўных кірунках: на аснове здабыткаў культурнай спадчыны шляхам звароту да назапашанага вопыту, адбора яго найбольш адпаведных канкрэтным умовам форм і іх інтэрпрэтацыі; у выпадку ўзнікнення навацый або запазычання культурных узораў у іншых сацыякультурных сістэмах шляхам адаптацыі новых культурных форм да патрэбаў асяроддзя. Мы прапануем разглядзець першы варыянт пошуку ўстойлівасці культуры, пры якім выхад са стану нераўнавагі здзяйсняецца ў працэсе звароту да папярэдняга культурнага вопыта.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучаснай культуралогіі культурная спадчына разглядаецца як сукупнасць дасягненняў духоўнай культуры грамадства, увесь яго гістарычны вопыт, які ўключае як актуальныя кампаненты, так і такія, што пакуль не прыжыліся, але існуе магчымасць звароту да іх пазней. Большая частка культурных праграм з часам губляе сваю актуальнасць і, паступова забываючыся, знікае з ужытку носьбітаў культуры альбо відазмяняецца ў працэсе ўсталяваня новай сістэмы каштоўнасцей. Меншая частка такіх праграм, «наадварот, папаўняючыся, не знікае з радавой памяці чалавецтва, а пераходзіць з пакалення ў пакаленне, з эпохі ў эпоху, з аднаго гістарычнага тыпа грамадства ў іншы, захоўваючы ў цэласнасці сваё інфарматыўнае ядро» [5, с. 11].

Выкарыстанне назапашанага папярэднімі пакаленнямі масіва ўзораў, каштоўнасцей, сімвалаў, сэнсаў культуры магчыма пры іх адаптацыі да актуальных умоў. Змены ў палітыцы, эканоміцы, навуцы і іншых сферах сацыяльнага жыцця непазбежна выклікаюць неабходнасць мадэрнізацыі культурнага вопыту продкаў з мэтай выкарыстання яго ў адпаведнасці з новай сітуацыяй. На наш погляд, у сучасных умовах узмацнення глабалізацыйных працэсаў зварот да фундаментальных асноў культуры прадстаўляе сабой альтэрнатыўны выбар вектараў развіцця. У сувязі з гэтым актуалізуецца багаты вопыт міжкультурнага ўзаемадзеяння арыстакратыі Вялікага Княства Літоўскага.

Культура магнатаў Вялікага Княства Літоўскага ўяўляла сабой гетэрагенную сістэму, функцыянаванне якой залежала ад шэрагу фактараў. Разнастайнасць духоўнага жыцця была абумоўлена працэсамі, якія адбываліся не толькі ў культурнай, але і палітычнай, сацыяльнай, рэлігійнай сферах. Спалучэнне комплекса фактараў забяспечвала разнастайнасць культуры і інварыянтнасць яе ўзораў, а іх узаемадзеянне спрыяла далейшаму ўскладненню структур і канфігурацый у яе межах.

Спецыфіка геаграфічнага размяшчэння земляў Вялікага Княства Літоўскага спрыяла актыўным міжкультурным і міжэтнічным узаемадзеянням у рэгіёне. Вынікам геаграфічнага размяшчэння земляў Беларускага Панямоння сталі цесныя кантакты з польскай культурай. Культурныя ўплывы польскай арыстакратыі праявіліся ў запазычанні гербавай сімволікі, прыняцці ідэалогіі сарматызму, выкарыстанні польскай мовы ў дзяржаўным справаводстве і інш. За ўсю гісторыю суіснавання працэс узаемадзеяння паміж гэтымі культурнымі сістэмамі быў даведзены да аўтаматызма.

Разам з тым, у гэтым узаемадзеянні прасочваўся не толькі прамы ўплыў польскай культуры, але і ўплыў культур іншых краін Еўропы. Культура Каралеўства Польскага, у сваю чаргу, знаходзілася ў арэале заходніх уплываў і выступала як рэцыпіент у дачыненні да донарскай еўрапейс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кай культуры. Польскае Каралеўства выступала як своеасаблівы пасрэднік, культурная прастора якога з'яўлялася месцам адаптацыі заходнееўрапейскіх узораў да культурнага ўзроўню Вялікага Княства Літоўскага.

Непасрэднае памежнае існаванне і цесныя ўзаемныя кантакты, якія адбываліся паміж культурамі Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага пачынаючы з XVI ст., даюць падставу меркаваць, што ў дадзеным выпадку мелі месца працэсы акультурацыі. У адпаведнасці з вызначэннем, дадзеным Р. Рэдфілдам, Р. Лінтанам і Дж. М. Херсковіцам, «акультурацыя ахоплівае сабой тыя з'явы, якія ўзнікаюць у выніку ўваходжання груп індывідаў, якія валодаюць рознымі культурамі, у непарыўны непасрэдны кантакт, што выклікае наступныя змяненні ў першапачатковых культурных патэрнах адной з груп ці іх абедзвюх» [1, с. 348—349].

Геаграфічнае размяшчэнне пэўным чынам садзейнічала кантактам з краінамі Заходняй Еўропы, якія заключаліся ў атрыманні адукацыі ў навучальных установах еўрапейскіх гарадоў, заключэнні шлюбаў з прадстаўнікамі еўрапейскай арыстакратыі, запрашэнні магнатамі заходнееўрапейскіх дзеячаў навукі, культуры і мастацтва, замежных вандроўках магнатаў (пэрэгрынацыях) і г.д.

Паказальна, што вандроўныя ініцыятывы арыстакратыі падтрымліваліся ў Вялікім Княстве Літоўскім на ўзроўні дзяржавы. У 1457 г. Казімірам IV быў выдадзены акт, у якім адзначалася: «Також прызваляем, абы княжата, рыцары, баяры дабравольна мелі бы моц выехаці з нашых зямель Княства вялікага для лепшага шчасця набыцця, альбо ўчынкаў рыцарскіх да каждых зямель, старон, толькі выміняючы непрыяцельскае» [4, с. 86].

Імкненне ў асяроддзі магнатэрыі да разнастайных новаўвядзенняў, што было выклікана не толькі прагай прагрэсу, але нярэдка жаданнем прытрымліваецца моды, вымушала арыстакратаў супрацоўнічаць з прадстаўнікамі інтэлектуальна-творчай эліты. Інтэлектуальна-творчае асяроддзе Вялікага Княства Літоўскага складалася з асветнікаў, вучоных, багасловаў, літаратараў, мастакоў, многія з якіх былі выхадцамі з розных краін Еўропы. Магнаты аказвалі падтрымку творцам у выглядзе мецэнацкай дапамогі, апекаванні талентаў, патраніравання разнастайных устаноў, налажванні друкарскай справы і інш.

Землі Вялікага Княства Літоўскага характарызаваліся дастаткова высокім узроўнем развіцця навуковай думкі. Павышэнню прэстыжа адукаваных членаў грамадства садзейнічаў шэраг мер, якія прымаліся на дзяржаўным узроўні. Жыгімонт I, які апекаваў Кракаўскі ўніверсітэт, дараваў прафесарам універсітэта правы высокародства (nobilitatis). Атрыманне высокародства не па праву паходжання, а за разумовыя здольнасці, адлюстроўвала прызнанне адукаванасці і высокі статус інтэлектуальнай эліты.

Відавочна роля палітычнага фактара ў фарміраванні культуры Вялікага Княства Літоўскага. На кожным гістарычным этапе мелі месца знакавыя падзеі, якія ў многім прадвызначалі кірунак далейшага развіцця культуры. Такімі падзеямі з'яўляліся, напрыклад, утварэнне Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, стварэнне федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай з Польскім Каралеўствам, падзелы Рэчы Паспалітай і інш.

Значным культурным цэнтрам з'яўляўся горад Гродна — сядзіба вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх. Тут размяшчаліся рэзідэнцыі манархаў іншаземнага паходжання Боны Сфорцы, Стэфана Баторыя, якіх прыцягвала не толькі геаграфічная блізкасць (хаця відавочна блізкасць Гродна да каралеўскага двара ў Кракаве, а пазней — Варшаве ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Вялікага Княства Літоўскага), але і падабенства ў сацыякультурнай сферы. Як адзначае мастацтвазнаўца В. Бажэнава са спасылкай на сучаснага польскага гісторыка Я. Сташэўскага, «кароль Аўгуст III, узводзячы замак у Гродна, ставіў сваёй мэтай не толькі пабудаваць рэзідэнцыю на час сеймаў, але і стварыць у гэтым горадзе цэнтр «палітычнага» саюза Саксоніі, Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, але на тэрыторыі апошняга» [2, с. 18].

Буйныя ўладанні магнатаў з'яўляліся прамым увасабленнем эканамічнай і адпаведна — палітычнай магутнасці арыстакратычных родаў. Эканамічная самастойнасць давала магчымасць праводзіць незалежную палітыку, з'яўлялася пэўным гарантам свабоды. У сувязі з гэтым, выбар магнатамі кірункаў развіцця ў вялікай ступені залежаў ад рэалізацыі эканамічных інтарэсаў, а эканамічны ўзровень абумоўліваў культурны. Разам з тым, важна адзначыць узаемазалежнасць культурнага і эканамічнага аспектаў у працэсе развіцця соцыўма. Вызначаны М. Вэберам уплыў светапогляднай пазіцыі вернікаў-пратэстантаў на ўзровень іх гаспадарчай дзейнасці можна разглядаць на прыкладзе магнатаў, якія ў выніку Рэфармацыі перайшлі ў пратэстантызм (М. Дарагастайскі, М. Радзівіл Чорны, Г. Хадкевіч і інш.) [3].

Рэлігія, як спецыфічная сістэма каштоўнастна-сэнсавых установак, займала значныя пазіцыі ў светапоглядзе людзей XIV — XVIII стст., што прадвызначала ступень яе ўплываў на развіццё культуры гэтага перыяда. Суіснаванне шэрагу канфесій, рэлігійны плюралізм і верацярпімасць з'яўляліся заканамерным вынікам асаблівага геапалітычнага становішча Вялікага Княства Літоўскага.

Моцным імпульсам для дынамічных працэсаў у духоўнай культуры магнатаў стала Рэфармацыя. Рэлігійны і грамадска-палітычны рух, ахапіўшы Еўропу, у сярэдзіне XVI ст. распаўсюдзіўся на землях Вялікага Княства Літоўскага. У выніку мясцовая сацыякультурная практыка ўзбагацілася дасягненнямі за-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

ходнееўрапейскай культуры. Адаптацыя асноўных палажэнняў рэфармацыйнай ідэалогіі адбывалася шляхам стварэння магнатамі новых рэлігійных устаноў і школ, наладжвання друкарскай справы, мецэнацкай дзейнасці і інш.

Папулярнасць ідэй Рэфармацыі на землях Вялікага Княства Літоўскага была абумоўлена, у першую чаргу, падрыхтаванасцю арыстакратычнага асяроддзя да ўспрыяцця гэтых навацый. Магнатам, добра знаёмым з культурным жыццём еўрапейскіх краін, былі зразумелы пытанні, узнятыя рэфарматарамі. Разнастайнасць ідэйных плыняў, узнікшых у працэсе дыскусій, — з аднаго боку, і рэлігійны плюралізм, які існаваў у Вялікім Княстве Літоўскім, — з другога, давалі магнатам свабоду выбару. У некаторай ступені прыняцце пратэстантызму можна разглядаць як спробу стварэння новай элітарнай традыцыі, абумоўленую патрэбнасцю змяненняў у культурным працэсе. Зацікаўленасць у рэфармацыйных працэсах менавіта магнацкай меншасці суправаджалася адсутнасцю іх шырокай падтрымкі іншымі слаямі грамадства.

Актывізацыі працэсу акультурацыі на землях Вялікага Княства Літоўскага спрыяла пашырэнне ідэй Контррэфармацыі, якія прадоўжылі актыўнае трансфармаванне мясцовых традыцый, што асабліва праявілася ў дзейнасці прадстаўнікоў ордэна іезуітаў. Іезуіты садзейнічалі распаўсюджанню заходне-еўрапейскіх культурных уплываў шляхам шырокай папулярызацыі адукацыі, заснавання навучальных устаноў, пашырэння кнігадрукавання і інш.

У якасці прыклада нагадаем дзейнасць дзяржаўнага і ваеннага дзеяча, мецэната і пісьменніка Мікалая Крыштофа Радзівіла. Фарміраванне асобы маладога магната, яго густаў і прыхільнасцей адбывалася пад непасрэдным уплывам узораў еўрапейскай культуры. Радзівіл вучыўся ва ўніверсітэтах Страсбурга і Цюбінгена, падарожнічаў па гарадах Германіі, Італіі, Аўстрыі, Францыі, наведаў краіны Блізкага Усходу. Багаты культурны вопыт, высокі ўзровень адукацыі, прагрэсіўнасць поглядаў і фінансавыя магчымасці дазволілі Мікалаю Крыштофу займацца актыўнай культуратворчай дзейнасцю (шырокае будаўніцтва ў Нясвіжы, сярод пабудоў — касцёл Божага Цела (1587—1593) — першы помнік архітэктуры барока на тэрыторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы; фундацыя шэрагу культавых пабудоў; мецэнацкая дзейнасць; выданне дзённіка падарожжаў і інш.).

На гэтай хвалі ў прыватнаўласніцкіх уладаннях пачынаецца актыўная культуратворчая дзейнасць магнатаў, якая праявілася ў падтрымцы кнігадрукавання, стварэнні бібліятэк, распаўсюджванні мецэнацтва, патраніраванні розных відаў мастацтва, адкрыцці адукацыйных устаноў і інш. Такім чынам, у шырокай культуратворчай дзейнасці магнатаў адлюстраваліся працэсы акультурацыі, якія мелі месца ў культуры другой паловы XVI — XVII стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з дэтэрмінант духоўнай культуры магнатаў у XVIII ст. з'яўлялася яе арыентацыя на антычныя традыцыі. Дадзеная тэндэнцыя атрымала найбольш выразнае ўвасабленне ў прыняцці магнатамі ідэалогіі сарматызму. Увасобленасць антычных традыцый у культурным жыцці магнатаў Вялікага Княства Літоўскага адзначае В. Бажэнава. Згодна з яе пазіцыяй, тоеснасць культуры магнатаў з антычнай традыцыяй знаходзіла праяўленні ў стварэнні міфа аб паходжанні магнатаў ад старажытнарымскіх герояў і патрыцыяў; у выхаванні маладых пакаленняў на прыкладах антычнай гісторыі з ўсведамленнем значнасці грамадзянскага статуса чалавека, яго маральных абавязкаў, ролі ў грамадскім будаўніцтве і інш.; у адпраўленні пахавальнага культа («pompa funebris»); у гістарычным дакументаванні жыцця і паступкаў, якое падразумявала вядзенне дыярыўшаў і інш. [2].

Арыентацыя на антычныя ідэалы фарміравала свядомую грамадзянскую пазіцыю магнатаў, асноўнай мэтай якой было выкананне грамадскага абавязку, служэнне яго ідэалам. Ідэя маральнай адказнасці магнатаў ураўнаважвала ўласцівае ім, як прадстаўнікам элітарнай групы, адчуванне асабістай перавагі перад астатнімі членамі соцыўма. Грамадзянская пазіцыя магнатаў грунтавалася на месіанскай свядомасці: усведамленні пачуцця адказнасці і выканання творчай ролі ў гісторыі. Гэта актуалізавала прытрымліванне нормаў вайсковай этыкі, імкненне да асветы і асветніцкай дзейнасці, фарміравання высокіх маральных якасцей у нашчадкаў і інш.

Магнаты выступалі ініцыятарамі інтэнсіўных працэсаў якаснага змянення культуры Вялікага Княства Літоўскага не толькі шляхам пераасэнсавання гістарычнай спадчыны, але і ў выніку запазычанняў з іншых культур. Гэта праявілася ў распаўсюджванні на землях Вялікага Княства Літоўскага прагрэсіўных ідэй і феноменаў заходнееўрапейскай культуры. Культуратворчая дзейнасць высокаадукаваных прадстаўнікоў магнатэрыі, актыўныя міжкультурныя ўзаемадзеянні (падтрымка творчых ініцыятыў, пашырэнне новых поглядаў і г.д.) спрыялі актыўнаму развіццю культуры Вялікага Княства Літоўскага.

**Літаратура:**

1. Антология исследований культуры. Т. 1. Интерпретация культуры/Ред.: С.Я. Левит. – СПб.: Университетская книга, 1997. – 548 с.

2. Баженова, О.Д. Радзивилловский Несвиж. Росписи костёла Божьего Тела/О. Баженова. – Минск: Харвест, 2010. – 416 с.

3. Вебер, М. Избранное: протестантская этика и дух капитализма/М. Вебер. – М.: Российская политическая энциклопедия, 2006. – 656 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент./Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Минск: БелСЭ, 1989. — 573 с.
5. Ширшов, И. Е. Динамика культуры/И. Е. Ширшов. — Мн: Изд-во БГУ. — 112 с.

*Попова А.А.*
*БГАИ, Минск.*

## ДРАМАТУРГИЧЕСКИЕ И ЭСТЕТИЧЕСКИЕ ОСОБЕННОСТИ КИНОФИЛЬМОВ ЖАНРА «ХОРРОР» (НА МАТЕРИАЛЕ БЕЛОРУССКОГО КИНЕМАТОГРАФА

Кинематограф, как наиболее современный, мобильный и массовый вид искусства отражает процессы, происходящие в обществе, а также принимает активное участие в формировании морально-нравственных ценностей, стереотипов поведения, культурной и национальной идентичности граждан страны. Национальная идентичность выражается не только в фильмах исторического плана, но и в фильмах о современности и о будущем, поскольку в них также имеет место работа с этнокультурными ценностями народа. Развиваясь в тесной взаимосвязи с особенностями национального самосознания, жанровые модели заимствуют многое — начиная от драматургических конструкций, метасюжетов и заканчивая художественным решением — из традиций мирового искусства, а также традиций других, не всегда смежных, жанров, ассимилируя новейшие авторские концепции, технологии, драматургические конструкции и принципы художественного решения.

В данном контексте интересной попыткой работы в таком не самом характерном для отечественного кинематографа жанре, как хоррор-фильм (фильм ужасов, в процессе рекламной кампании заявленный его создателями как «бульба-хоррор») является фильм режиссера Андрея Кудиненко «Масакра» (2010 год).

«Хоррор» с полным правом можно назвать одним из самых любопытных явлений в жанровой системе кинематографа. На протяжении уже многих десятилетий этот жанр является одним из самых популярных у публики, он неизменно составляет значительную часть современного кинопроката. Кроме того, на протяжении всей истории своей эволюции фильм ужасов практически мгновенно ассимилировал новейшие авторские концепции,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ